# *Альхоўскае возера*



***У пяці вярстах ад вёскі Пацэвічы знаходзіцца Альхоўскае возера. Вельмі даўно на гэтым месцы была вёска. Аднойчы пад выглядам старца прыйшоў у вёску сам бог і пачаў прасіцца нанач. Але ніхто з беззаконных жыхароў не зжаліўся над жабраком і не пусціў яго ў сваю хату. Выйшаўшы за вёску, жабрак пракляў усіх яе жыхароў, толькі аднаго старога, што спаў, не пракляў. Як толькі той прачнуўся і выйшаў за ваколіцу, зямля з хатамі стала асядаць, і ў той жа час ад вялікага дажджу гэта месца пачало напаўняцца вадою.***

***Калі праведны стары азірнуўся на вёску, дык убачыў возера, а пасярэдзіне яго, якраз там, дзе стаяла яго хата, плаваў стол з раскрытаю на ім кнігаю, якую чытаў ён перад сном і закрыць не паспеў. Праз сто год затопленая вёска ізноў пабачыла свет божы, і вось як гэта было: пастух убачыў крыж на беразе возера і хацеў падняць яго, але крыж аказаўся на ланцугу. Пастух пацягнуў ланцуг - і на паверхню возера ўсплыла вёска. Радасныя жыхары ўзнялі вясёлы крык. Пастух так спужаўся, што выпусціў ланцуг з рук і на яго вачах вёска ізноў пайшла ў ваду яшчэ на сто год.***